# «НАВАТ САМАЯ ЦЕСНАЯ ІНТЭГРАЦЫЯ НЕ АДМЯНЯЕ СУВЕРЭНІТЭТ ДЗЯРЖАЎ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Тут не абысціся без паступовага кансэнсуснага фарміравання нейкіх наднацыянальных органаў, у тым ліку, магчыма, палітычных. Дапускаем, што ў такім выпадку ў практычную плоскасць пяройдзе і пытанне аб увядзенні новай адзінай валюты. Час пакажа», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. «Поспех Адзінай эканамічнай прасторы важны не толькі для нашых народаў і эканомік. Гэты праект можа стаць прыцягальным полюсам для іншых краін, у тым ліку для нашай бліжэйшай суседкі Украіны. Паколькі яна працавала разам з намі над першым правобразам АЭП».

## Еўразійскі саюз як неад'емная частка агульнаеўрапейскай інтэграцыі

«Нам нельга замыкацца ў гэтай інтэграцыі (АЭП. — **Заўвага БЕЛТА**). Еўразійскі саюз я бачу як неад'емную частку агульнаеўрапейскай інтэграцыі. Наш саюз павінен стаць ключавым рэгіянальным іграком, які дапаможа выбудоўваць адносіны з вядучымі сусветнымі эканамічнымі структурамі». Паводле яго слоў, менавіта адсюль зыходзіць прапанова «тройкі» аб такім узаемадзеянні з Еўрасаюзам, якое прывяло б у канчатковым выніку да стварэння агульнай эканамічнай прасторы ад Лісабона да Уладзівастока. «Дарэчы, адзіная мытная граніца на гэтым шляху праходзіць праз Брэст. Мы прапануем «інтэграцыю інтэграцый». Ён нагадаў, што па ініцыятыве Беларусі ў снежні мінулага года кіраўнікі дзяржаў ЕўрАзЭС пацвердзілі ў сваёй дэкларацыі намер працаваць менавіта ў гэтым напрамку. «Гэта не недарэчнае жаданне, а прадыктаваная рэаліямі паслядоўная пазіцыя». На думку Прэзідэнта Беларусі, такая інтэграцыя на постсавецкай прасторы хутчэй прывядзе да больш цесных і раўнапраўных адносін з Еўрасаюзам і пабудовы Вялікай Еўропы, чым сепаратныя хаджэнні па еўрапейскіх кабінетах.

«Для гэтага, вядома, патрэбны адпаведны ўзровень развіцця АЭП і будучага Еўразійскага саюза. Ён павінен стаць сталай структурай, сур'ёзным эканамічным іграком на еўразійскім рынку, магутным партнёрам Еўрасаюза. Зразумела, у гэтай справе многае залежыць і ад еўрапейцаў — наколькі яны гатовы супрацоўнічаць на аднолькавых правах».

## У стварэнні Еўразійскага саюза не трэба бачыць спробу нейкага падзелу Еўропы

«Інтэграцыя Беларусі, Расіі і Казахстана — не супраць кагосьці. У стварэнні Еўразійскага саюза не трэба бачыць спробу нейкага падзелу Еўропы, — падкрэсліў Прэзідэнт. Паводле яго слоў, Беларусь, знаходзячыся на стыку двух інтэграцыйных саюзаў, асабліва зацікаўлена ў іх узаемным збліжэнні. «Грандыёзны, але цалкам рэалістычны праект стварэння Еўразійскага саюза тоіць вялікія выгады для ўсяго кантынента. Магчымасць работы па аднолькавых правілах на рынку ад Атлантыкі да Ціхага акіяна ўмацуе экспартны патэнцыял нашых прадпрыемстваў і прывабнасць нашых эканомік для замежнага бізнэсу».

## Толькі роўнасць партнёраў дасць магчымасць стварыць надзейную аснову для АЭП

«Ствараемая намі канструкцыя пашыранай інтэграцыі павінна быць трывалай. Інакш няма сэнсу траціць на яе столькі сіл», — упэўнены беларускі лідар. На думку Аляксандра Лукашэнкі, надзейнасць і даўгавечнасць новага механізма вызначаюцца зрэшты тым, ці забяспечвае ён паўнацэнную абарону інтарэсаў яго ўдзельнікаў. «Неабходна дакладна ўсведамляць: любыя ўшчамленні іх правоў, якія, можа быць, здаюцца сёння дробнымі, заўтра створаць трэшчыны, якія разваляць спачатку давер, а затым і створаную неймавернымі агульнымі намаганнямі новую структуру, — адзначыў Прэзідэнт. — Гэта галоўнае. Увесь астатні масіў вельмі складаных юрыдычных, мытных, фінансавых і іншых пытанняў можна вырашыць. І мы сумесна вырашым усе, і за кароткі час». «Тут не павінна быць прымітывізму. Размова, вядома ж, не аб тым, каб сабраць і падзяліць на траіх багацці, што належаць нашым народам. Беларусам гэта не патрэбна». Пры гэтым ён падкрэсліў: «Але толькі роўнасць партнёраў, у тым ліку роўнасць умоў гаспадарання з роўным доступам да адзінай энергетычнай і транспартнай сістэмы, дасць магчымасць стварыць надзейную аснову для нашага саюза. Толькі тады людзі, бізнэс павераць нам і нашай інтэграцыі і падтрымаюць яе сваімі справамі і намерамі». «На няроўнай аснове саюз аднадумцаў і партнёраў не пабудаваць. Гэта аксіёма! Веру, што менавіта такая ідэалогія закладваецца ў наш новы саюз», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«На апошніх перагаворах з кіраўніцтвам Расіі мы дамовіліся аб неабходнасці работы прадпрыемстваў і прадпрымальнікаў нашых краін у роўных умовах. У аналагічным ключы праходзяць сустрэчы ў рамках АЭП. Наперадзе, вядома, яшчэ цярністы шлях перагавораў, але разам з нашымі партнёрамі па «тройцы» мы яго пераадолеем у тэрмін і паспяхова».

## Глыбокая інтэграцыя з найбольш блізкімі суседзямі для Беларусі з'яўляецца натуральным шляхам развіцця

«Для Беларусі глыбокая інтэграцыя з найбольш блізкімі суседзямі была, ёсць і будзе натуральным шляхам развіцця», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, два рэферэндумы, праведзеныя ў Беларусі ў першай палове 90-х гадоў, абсалютнай большасцю насельніцтва далі ўладзе мандат на інтэграцыю. На абломках СССР з'явілася першая інтэграцыйная структура — СНД з цэнтрам у Мінску. На аб'яднальных прынцыпах будаваліся АДКБ і ЕўрАзЭС. «І тое, што ў нас існуе некалькі міждзяржаўных утварэнняў, — гэта таксама нармальна. Мы шукаем, намацваем тыя механізмы, якія задаволілі б інтарэсы ўсіх удзельнікаў. І галоўнае, рэальна працавалі на нашых людзей».

«Ствараючы ў 90-я гады Саюзную дзяржаву Беларусі і Расіі, мы выступілі першапраходцамі ў найбольш цесным інтэграванні дзвюма незалежнымі дзяржавамі самага шырокага кола сфер жыцця. З яе з'яўленнем сфармуляваны і апрабаваны прынцып разнаскораснай і рознаўзроўневай інтэграцыі, — гаворыцца ў артыкуле. — Ужо на працягу паўтара дзесятка гадоў Саюзная дзяржава — каталізатар і своеасаблівая маштабная лабараторыя глыбокай інтэграцыі. Гэта прадмет нашай асаблівай гордасці. Паколькі мы змаглі пашырыць рамкі інтэграцыі ад эканомікі да сацыяльных і нават часткова палітычных пытанняў. Нам удалося сур'ёзна рушыць наперад у забеспячэнні роўных правоў грамадзян, уніфікацыі нацыянальных заканадаўстваў, каардынацыі знешнепалітычнай дзейнасці. Рэальным стала ажыццяўленне маштабных міждзяржаўных праграм, у тым ліку ў сферы навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва».

Як адзначыў Прэзідэнт, адзіная сістэма сацыяльных гарантый, роўны доступ да адукацыі, паслуг аховы здароўя, беспераШкоднае працаўладкаванне, свабода перамяшчэння і выбару месца жыхарства, якія сталі магчымымі дзякуючы Саюзнай дзяржаве, з'яўляюцца арыенцірамі для далейшай работы ў фармаце «тройкі». «Па некаторых напрамках мы нават наперадзе Еўрапейскага саюза».

На яго думку, інтэграцыйныя напрацоўкі ў рамках Саюзнай дзяржавы далі магчымасць разумна і з упэўненасцю прымяняць іх у больш шырокім, шматбаковым фармаце. «Ні для каго не сакрэт, што беларуска-расійскае Пагадненне аб Мытным саюзе 1995 года служыць апорным каркасам дагаворна-прававой базы Мытнага саюза Беларусі, Казахстана і Расіі. Створаная ў працэсе саюзнага будаўніцтва мытная і пагранічная інфраструктура сусветнага ўзроўню дае магчымасць эфектыўна вырашаць задачы, якія стаяць цяпер перад Мытным саюзам і АЭП».

«Важна, каб і ў далейшым Саюзная дзяржава, Мытны саюз, АЭП узбагачалі і ўзаемадапаўнялі адно аднаго. Наша задача — не страціць, а максімальна выкарыстоўваць увесь існуючы інтэграцыйны патэнцыял».

## «АЭП нельга абмяжоўвацца толькі заходнім вектарам»

«Нашай інтэграцыйнай структуры нельга абмяжоўвацца толькі заходнім вектарам. Важнейшай задачай павінна стаць і цесная інтэграцыя з дзяржавамі і эканамічнымі аб'яднаннямі на Усходзе, перш за ўсё з нашым стратэгічным партнёрам Кітаем», — гаворыцца ў артыкуле.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, кожная з трох краін ужо мае багаты вопыт работы з дзяржавамі Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёну. «Аб'яднаўшы свае намаганні мы будзем больш паспяхова пашыраць нашы інтарэсы. Беларусь непасрэдна наблізіцца да рынкаў АЦР, які, верагодней за ўсё, стане рухавіком эканомікі планеты ў гэтым стагоддзі».

## У АЭП неабходна стварыць магутныя транснацыянальныя карпарацыі

«Навошта штучна насаджаць дубліруючыя вытворчасці там, дзе попыт можа быць задаволены са значна меншымі затратамі і на высокім узроўні якасці дзеючымі прадпрыемствамі? Хіба мы не прайграем ад канкурэнцыі адзін з адным на знешніх рынках? Замест такога «самаедства» трэба было б ствараць усе ўмовы для з'яўлення на нашай прасторы магутных канкурэнтаздольных транснацыянальных карпарацый і іх выхаду на рынкі трэціх краін», — лічыць беларускі лідар. Паводле яго слоў, трэба закласці асновы для далейшай мадэрнізацыі эканомік і ўкаранення інавацый. «І мы пачалі падыходзіць ужо да гэтага праз канкрэтныя маштабныя і навукаёмістыя праекты — сумеснае будаўніцтва АЭС у Беларусі, сумеснае стварэнне і вывядзенне ў космас спадарожнікаў, стварэнне сістэмы кіравання імі». «Але рух ідзе марудна, залішне марудна. Калі ў кіраўніцтва нашых краін ёсць агульная цвёрдая пазіцыя на карысць такой інтэграцыі — а яна ёсць! — няхай і чыноўніцтва на ўсіх узроўнях хутчэй разварочваецца», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Пры гэтым ён лічыць, што «тут, вядома, максімум залежыць ад самага вялікага партнёра інтэграцыі — Расіі».

«Трэба дабіцца прынцыповага павароту тварам да інтэграцыі ў рамках усіх інтэграцыйных структур — Саюзнай дзяржавы, Мытнага саюза, АЭП, ЕўрАзЭС, СНД — не на паперы, а на справе. Зрабіць такі падыход штодзённай практыкай узаемадзеяння. Людзі нашых краін чакаюць гэтага ўжо цяпер, без прамаруджвання», — дадаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

## Інтэграцыя не самамэта

Інтэграцыя не самамэта. Гэта інструмент дасягнення вышэйшай мэты — росту дабрабыту і якасці жыцця людзей. На думку кіраўніка дзяржавы, сённяшні кантынентальны і нават транскантынентальны фінансавы крызіс, які толькі ўзмацняе сусветную нявызначанасць і хаос, падказвае: галоўная процівага крызісу — фарміраванне ёмістага агульнага рынку і баланс інтарэсаў. «Стварэнне сур'ёзных аб'яднальных саюзаў — правільны захад да стабільнага свету. Значыць, без інтэграцыі нельга». У сваім артыкуле ён таксама адзначыў, што абнародаванне цяпер у вядучых СМІ цвёрдага намеру рашуча паглыбляць інтэграцыю невыпадковае. «Гэта своеасаблівы маніфест, які ідзе ад жыцця. Вядома, заяўленыя намеры трэба будзе паслядоўна і цвёрда рэалізоўваць. Але ж і ў Бібліі сказана: «Спачатку было слова». Прэзідэнт Беларусі падкрэсліў, што цяпер патрэбны неадкладны пераход да практычных дзеянняў. «Паколькі за словам сур'ёзнага палітыка заўсёды ідзе справа. І я як Прэзідэнт Беларусі буду цесна ўзаемадзейнічаць з кіраўніцтвам Расіі і Казахстана, каб рэалізаваць на практыцы гэту правільную стратэгію глыбокай інтэграцыі», — запэўніў ён.

## Аляксандр Лукашэнка лічыць правільнай апублікаваную ў «Известиях» інтэграцыйную стратэгію Уладзіміра Пуціна

«Сёння мы знаходзімся на парозе стварэння якасна новага інтэграцыйнага ўтварэння. З 1 студзеня 2012 года з'явіцца Адзіная эканамічная прастора Беларусі, Расіі і Казахстана — ужо і дэ-юрэ, і дэ-факта», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка ў публікацыі.

Што датычыцца артыкула прэм'ер-міністра Расіі Уладзіміра Пуціна, які раней быў апублікаваны ў «Известиях», Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Не ў парадку кампліменту майму калегу, былому прэзідэнту Расіі і цяперашняму прэм'еру, скажу, што гэта публікацыя — сапраўдная падзея. Расія ўпершыню за многія гады ясна і недвухсэнсоўна заявіла аб прыярытэце адносін з дзяржавамі, з якімі, перафразуючы класіка, выйшла з агульнага савецкага шынялю».

«Больш таго, па-мойму, упершыню ў навейшай гісторыі Расіі аб гэтым гаворыць кандыдат у прэзідэнты. Фактычна, як я разумею, у сваёй перадвыбарнай знешнепалітычнай праграме», — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы.

«Гэта дарагога каштуе. За словамі артыкула — стратэгія. Правільная стратэгія. І толькі недалёкія людзі могуць абвінавачваць публікацыю і яе аўтара ў перадвыбарнай кан'юнктурнасці», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі.

«Хіба гэта кан'юнктуршчына — усведамленне лідарам, нацэленым на выбранне на вышэйшую пасаду ў Расіі, таго, што не атрымаецца ўмацаваць краіну, уладкоўваючы яе толькі знутры? Унутраная нацыянальная кансалідацыя неабходна. Але гэтага недастаткова! Для сапраўднага поспеху Расіі, як і любой іншай дзяржавы, трэба таксама выбудаваць адносіны з суседзямі на трывалай аснове, гэта значыць узаемавыгаднай і раўнапраўнай. Толькі на такіх прынцыпах! Без гэтага не будзе стабільнасці і бяспекі ні ў Расіі, ні ў яе суседзяў. Іншае мы праходзілі ўжо і ведаем, чым усё завяршаецца», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, гаварыць аб кан'юнктурнасці могуць толькі тыя, хто не ведае фактаў. «Ідэя Адзінай эканамічнай прасторы Расіі, Беларусі, Украіны і Казахстана належыць якраз Уладзіміру Пуціну. Ён агучыў яе яшчэ ў пачатку 2003 года, калі мы сабраліся на нефармальнай сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў у яго падмаскоўнай рэзідэнцыі. Зразумела, выбары 2012 года тады не былі і на гарызонце», — адзначыў беларускі лідар.

Прэзідэнт Беларусі таксама заявіў, што ні ў якай меры не падзяляе поглядаў скептыкаў аб «дэкларатыўнасці» зробленых у артыкуле заяў. «Бо выкладзеная ў артыкуле стратэгія інтэграцыі адрасавана не толькі электарату і нам, суседзям Расіі, але і ўсім сусветным цэнтрам сілы. Тут блеф — сабе даражэй, таму што, атрымаўшы гэты магутны сігнал, усе зробяць свае стратэгічныя вывады. Палітыку і палітыкаў паважаюць толькі ў выпадку іх сур'ёзнасці і паслядоўнасці. Таму не павінна быць сумненняў у шчырасці акрэсленых Уладзімірам Пуціным намераў», — гаворыцца ў артыкуле.

Аляксандр Лукашэнка не лічыць дзіўным, што рэакцыя часткі знешніх цэнтраў на ініцыятыву расійскага прэм'ера пазбаўлена энтузіязму. «Яно і зразумела: якога міжнароднага ігрока абрадуе вестка аб фарміраванні новага магутнага адзінага рынку з вельмі значным вытворчым, рэсурсным, інтэлектуальным патэнцыялам — несумненна агрэсіўнага канкурэнта», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, у Беларусі рэакцыя на публікацыю ў «Известиях» таксама неадназначная. «Аб звычайных русафобскіх стогнах «пятай калоны» няма чаго нават гаварыць. Тут усё ясна: іх клопат — не аб краіне», — заўважыў ён.

«Але ёсць частка грамадства, якая шчыра заклапочана, паколькі на коне лёс дзяржавы. Ад гэтай думкі нельга проста адмахнуцца. Людзям трэба на справе паказаць, што канкрэтна ім дасць гэты новы саюз. Даказаць, што інтэграцыйныя намеры — не палітычныя гульбішчы, а рэальныя перадумовы далейшага паляпшэння дабрабыту чалавека. А гэта ўжо наша, палітыкаў, задача», — адзначыў беларускі лідар.

# МВФ ЗАДАВОЛЕНЫ ДЗЕЯННЯМІ ЎРАДА І НАЦБАНКА, АЛЕ ПАТРАБУЕ БОЛЬШ ЖОРСТКАЙ ЭКАНАМІЧНАЙ ПАЛІТЫКІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Нацыянальнаму банку варта далей і хутчэй павышаць працэнтныя стаўкі да ўзроўняў, якія перавышаюць чаканы ўзровень інфляцыі, бо насельніцтва павінна быць упэўнена ў тым, што іх зберажэнні прынясуць дадатныя даходы», — паведаміў Крыстафер Джарвіс. Дарэчы, ён лічыць, што ў Нацбанка і ўрада ёсць інструменты, якія неабходны для кантролю за дэвальвацыяй і інфляцыяй. Сярод іх ужо названыя дадатныя ў рэальным вызначэнні працэнтныя стаўкі, захаванне абмежаванняў па бюджэце і па крэдытаванні ў межах дзяржаўных праграм, абмежаванне росту заработнай платы. На апошнім пасяджэнні МВФ засяроджваў сваю ўвагу некалькі разоў і казаў пра тое, што трэба ўстрымацца ад далейшага павышэння стаўкі першага разраду. Аднак індэксацыю заробкаў ён падтрымлівае: «Я мяркую, што частковая індэксацыя была карыснай, бо абараняла інтарэсы і даходы насельніцтва. Гэтым самым адбывалася змякчэнне наступстваў інфляцыі. Таму на астатнюю частку года, думаю, будзе абгрунтаваным захаванне такой палітыкі».

Крыстафер Джарвіс выказаў упэўненасць у плацежаздольнасці Беларусі. Галоўнае, лічыць ён, каб і надалей праводзілася адпаведная эканамічная палітыка. «І мы гатовыя да аказання падтрымкі Беларусі ў тым, каб выпрацаваць і рэалізаваць такую палітыку», — сказаў кіраўнік місіі.

Між іншым, пакуль што не абмяркоўвалася канкрэтная сума магчымага крэдыту ад МВФ. «Але мы будзем гэтае пытанне разглядаць у межах наступнай місіі, калі яна адбудзецца», — запэўніў Крыстафер Джарвіс.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

# АБАРАНІЦЬ АД ТАВАРЫСТВАЎ АБАРОНЫ

## *Праўда спажыўца ў нашай краіне часта «з кулакамі»*

Не ўсе вытворцы ды гандляры на беларускім рынку цэняць сваю рэпутацыю. Многія лічаць за лепшае спрачацца да апошняга дыхання, чым замяніць няякасную прадукцыю ці вярнуць грошы. Таму пасіўныя ў абароне сваіх правоў спажыўцы маюць усе шанцы застацца ў дурнях. Пасіўныя — тыя, хто дагэтуль не зразумеў, нашто захоўваць чэк пасля паходу ў краму і талончык пасля паездкі ў грамадскім транспарце, і спрачацца з прадаўцом за кожны неадрэзаны металічны «хвосцік» на каўбасе. Пасіўныя — таксама і тыя, хто цалкам спадзяецца на чужога дзядзьку ў абароне ўласных правоў, не зрабіўшы прытым абсалютна нічога, каб іх можна было абараніць. Клапоцяцца пра іх заканадаўцы — прынамсі так яны матывуюць нядаўна распрацаваныя папраўкі ў закон аб абароне правоў спажыўцоў.

Там усур'ёз бяруцца за таварыствы, якія займаюцца абаронай правоў спажыўцоў (тыя, што дапамагаюць скласці прэтэнзіі да вытворцаў, прадаўцоў ці пастаўшчыкоў, прадстаўляюць інтарэсы спажыўцоў у судзе, праводзяць экспертызу тавараў і гэтак далей). Паводле дзейнага заканадаўства яны пакрываюць свае выдаткі за кошт спажыўцоў. З увядзеннем у дзеянне заканадаўства крамка будзе прыкрыта. Спажыўцы ў выйгрышы, здавалася б: цяпер, калі яны прайграюць справу, адным расчараваннем будзе менш. Але на што ж тады будуць існаваць таварыствы? Ды калі яны страцяць сродкі для існавання і пазакрываюцца, то ці ў выйгрышы застануцца спажыўцы, якіх не будзе каму абараняць? Законапраект плануецца разгледзець на найбліжэйшым пасяджэнні сесіі. Паспрабуем высветліць сітуацыю разам з адказным за яго падрыхтоўку **дэпутатам Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па жыллёвай палітыцы, будаўніцтве, гандлі і прыватызацыі Леанідам КАВАЛЕВІЧАМ.**

— Ёсць неадназначныя падыходы да такога спосабу фінансавання, — дыпламатычна тлумачыць сітуацыю парламентарый. — Некаторыя суды, напрыклад, адмаўляюцца выносіць рашэнні аб пакрыцці спажыўцам затрат на аплату паслуг грамадскіх аб'яднанняў спажыўцоў. У судах кіруюцца законам «Аб грамадскіх аб'яднаннях», які не прадугледжвае аказання імі платных паслуг, тым больш тым, хто не з'яўляецца членам арганізацыі. Гэта наогул не адпавядае сутнасці грамадскага аб'яднання, мэтам яго стварэння і прававому статусу.

Цень на грамадскія аб'яднанні па абароне правоў спажыўцоў кідае і выніковасць іх працы. Паводле статыстыкі Міністэрства гандлю, Беларускае таварыства абароны спажыўцоў аформіла 1077 прэтэнзій. З іх толькі 33 былі задаволеныя.

— А таварыствы, па ўсім відаць, і не зацікаўленыя ў станоўчым зыходзе, яны могуць брацца нават за тыя справы, якія заведама пройгрышныя: грошы ім заплацяць у любым выпадку, — каментуе Леанід Кавалевіч. — Больш за тое, у затратны механізм можна ўключыць усё, аж да прынтара, на якім раздрукоўваюць дакументы. Выдаткі на аплату працы, арэнды, паслуг сувязі і камунальных службаў, канцтавараў, выплату падаткаў... усё што заўгодна.

Л. Кавалевіч акцэнтуе, што пры такіх шырокіх магчымасцях фіксацыі затрат, у грамадскіх аб'яднанняў ёсць ільготы: зварот у суд для іх бясплатны — ім не трэба плаціць абавязковую дзяржаўную пошліну, як іншым суб'ектам.

Парламентарый мяркуе, што такія аб'яднанні павінны аказваць паслугі спажыўцам на бязвыплатнай аснове. За што ж ім тады існаваць?

— Яны павінны развіваць членства: каб як мага больш людзей уступала ў іх грамадскае аб'яднанне, і за кошт членскіх узносаў забяспечваць сваё фінансаванне, — прапануе дэпутат. — Няхай ужо нарэшце іх дзейнасць будзе адпавядаць статусу грамадскага аб'яднання. Яны заяўляюць, што займаюцца некамерцыйнай дзейнасцю — абараняюць правы спажыўцоў. Дык няхай і абараняюць на бязвыплатнай аснове. А вось калі дакажуць невінаватасць спажыўца і віну другога боку — вытворцы, прадаўца ці пастаўшчыка, тады вінаваты бок і будзе пакрываць іх выдаткі. Прапанаваны законапраект надзяляе іх такім правам. Пры такой схеме ў іх яшчэ на стадыі звароту спажыўца будзе шчырая зацікаўленасць: яны не стануць брацца за справу, у якой заведама няма шанцаў на выйгрыш. Бо пакуль, на жаль, можна канстатаваць, што ў некаторых выпадках грамадскія аб'яднанні карыстаюцца неадукаванасцю простага чалавека.

Ёсць пытанні ў парламентарыя і да прафесійнага ўзроўню супрацоўнікаў такіх арганізацый.

— Па роду сваёй дзейнасці спецыялісты таварыстваў па абароне правоў спажыўцоў павінны падмяняць адкакатаў у нейкай ступені. У той жа час статус адваката нашмат вышэйшы, чым у супрацоўнікаў грамадскіх аб'яднанняў. Дзейнасць адвакатаў кантралюецца. Да іх можна прад'явіць нейкія прэтэнзіі ў выпадку чаго. Супрацоўнікі ж таварыстваў нават атэстацыю не праходзяць. Хто там дае кансультацыі — насамрэч кваліфікаваны спецыяліст ці не?

Дэпутат нагадвае, што абаронай правоў спажыўцоў займаюцца таксама і мясцовыя выканкамы. «На бязвыплатнай аснове, — падкрэслівае ён. — Прычым спажывец можа звярнуцца як па месцы свайго пражывання, так і па месцы знаходжання таго, з кім збіраецца весці справу».

Дзеліцца народны выбраннік і праблемамі сваёй выбарчай акругі:

— Пачалі рабіць шмат мэблі, вокнаў. Мноства пытанняў узнікае. Прычына многіх — прававая неадукаванасць грамадзян. Ім акно паставілі, яны грошы заплацілі без дагавора. А раптам выраб бракаваны, што з ім рабіць без дагавора? У выканкаме, я ўпэўнены, перш чым брацца за справу, патлумачаць, без якіх дакументаў яе нельга выйграць.

На думку дэпутата, гэты шлях наогул больш надзейны: у мясцовай улады ёсць дадатковыя рычагі ўздзеяння. Можа, варта недзе дадатковую праверку нядобрасумленнага вытворцы арганізаваць... Можа, ён без ліцэнзіі такую дзейнасць вядзе.

Паводле інфармацыі народнага выбранніка, такому спосабу абароны — праз мясцовыя выканкамы — аддаюць перавагу ў рэгіёнах. Жыхары сталіцы тым часам часцей звяртаюцца ў адмысловыя грамадскія аб'яднанні, якія там найбольш актыўна і распаўсюджваюцца.

Самі прадстаўнікі таварystваў па абароне правоў спажыўцоў звяртаюцца да заканадаўцаў: як распавёў дэпутат, прапанаваныя папраўкі іх, натуральна, не задавальняюць. «Аднак мы абараняем інтарэсы ў першую чаргу простых людзей, — падкрэслівае парламентарый, — каб іх звароты знаходзілі вырашэнне. Пазітыўнае ці негатыўнае, гэта ўжо іншае пытанне, галоўнае, каб іх не падманвалі, гаварылі з імі шчыра з самага пачатку».

Ці варта абараняць спажыўцоў ад таварыстваў па абароне правоў спажыўцоў, пытанне неадназначнае. Бясспрэчна адно: кожнаму спажыўцу варта ў прынцыпе павышаць сваю самастойнасць і падкаванасць у галіне абароны ўласных правоў. Абарона спажыўца — справа найперш самога спажыўца. Пільнасць, у рэшце рэшт, яшчэ нікому не пашкодзіла.

**Ала МАЧАЛАВА.**

# ЛІТАРАЙ З'ЕЗДУ

**«Хто за, хто супраць?..» Вельмі актуальна пастаўленыя пытанні на з'ездзе Саюза пісьменнікаў Беларусі, які адбываецца ў гэтыя дні, часам віталі гарачымі воплескамі.**

І як заведзена на з'ездах — галасавалі. Мандатамі. Усё сур'ёзна. Як сур'ёзная і сітуацыя ў сучаснай беларускай літаратуры. Зрэшты, сур'ёзнасць сённяшняй сітуацыі кожны можа вызначыць па-свойму: ці то пісьменнік, ці выдавец, ці чытач. Нават розныя пісьменнікі і тыя называць розныя прычыны. Але погляд з вышыні з'езда (прэса сядзела на балконе і магла агледаць усю залу) дазваляе меркаваць пра тое, што прысутных, якіх зарэгістравалася 445 чалавек, падтрымалі бясспрэчную пазіцыю старшыні Саюза Мікалая Чаргінца, што «наша літаратура — частка нацыянальнай культуры». Сваю справаздачу старшыня пачаў па-беларуску. Ён падзякаваў сваім калегам, якія пішуць кнігі ў няпростых умовах, калі не ўсе адзначаюць і зразумець творчыя высілкі літаратараў, сябры Саюза пісьменнікаў Беларусі, калі ён, можна сказаць, гэтым здзяйсняюць грамадзянскі ўчынак. Калі крытыка «не дарасла» да разумення галоўнай, высокай, патрыятычнай сутнасці гэтых твораў, адпаведна, аддаляючы ад іх чытача. І што асабліва непакоіць літаратараў — юнага чытача, таму што аўтараў, якія сёння пішуць, шмат, а колькасць гадзін, якая адводзіцца ў школе на вывучэнне сучаснай беларускай літаратуры, недастатковая, каб ведаць усіх па імёнах і творах.

Абмалёўваць асаблівасць сучаснай сітуацыі працягвалі выступоўцы. Славамір Антановіч, напрыклад, закрануў тэму, што ў літаратурных часопісах друкуюцца бадай адны і тыя ж пісьменнікі, а некаторыя рэдактары зусім страцілі сціпласць: друкуюць у кожным нумары калонку галоўнага рэдактара... А некаторыя пісьменнікі лічаць сябе такімі класікамі, што нізкай крытыкі не прымаюць. Старшыня Віцебскай абласной арганізацыі Тамара Гусачэнка адважылася прымеціць, што пісьменнікі нават не прадстаўлены ў парламенце, у той час як вельмі патрэбны закон аб творчых саюзах, які б рэгламентаваў іх працу. Ды і тыражы «тоўстых» часопісаў не надта вялікія, а калі б існавала для іх дзяржпадтрымка і часопісы ішлі ва ўсе бібліятэкі краіны, то і тыраж бы адпаведна ўзрос. Наогул важна, як падаць творы. «Што, «Чорны квадрат» Малевіча — геніяльны твор? Ці проста тэхналогіі?..»

Што тут скажаш?.. Толькі адно: калі ў прынцыпе усё добра, але справа за малым — за чытачом — то на яго і трэба скіраваць усе высілкі. І тут пісьменнікаў звярнуў тварам да чытачоў міністр культуры Павел Латушка: абвясціўшы выхаванне чытача адным з найважнейшых кірункаў у працы міністэрства, ён чакаў, што гэтыя думкі прагучаць з вуснаў пісьменнікаў. Але на з'ездзе іх больш хвалявалі ўсё ж свае праблемы. Часткова дапамагаць іх вырашаць ад імя Міністэрства інфармацыі паабяцала першы намеснік міністра інфармацыі Лілія Ананіч: «Лепшае, што будзе напісана сёння, знойдзе дзяржаўнае фінансаванне».

О, колькі іх, аб'ектыўных прычын, якія не спрыяюць творчасці пісьменнікаў у Беларусі, могуць назваць літаратары: і неразуменне творчай асобы, і неразуменне некаторымі пісьменнікамі дзяржаўных задач, якія гэтыя пісьменнікі разумеюць, і густаўшчына ў выдавецтвах, і «выдавецтвы, дзейнасць якіх падрывае асновы маралі», і занадта прадузятая крытыка, і тых, хто не чытае. Сапраўды, страшна становіцца за літаратараў, як жа знайсці ўсё ж сілы для творчасці?

Але калі ёсць лідар, які ўмее зрабіць так, што ўсе гэтыя праблемы так ці інакш вырашаюцца, то няма падстаў для сумневу ва ўласным шляху. З такім настроем большасць выступоўцаў ухваліла працу Мікалая Чаргінца, для якога з'езд супаў з днём нараджэння і аказаўся асаблівым святам.

**Слухала Ларыса ЦІМОШЫК.**

## Абзац

◢ Сёлета за 9 месяцаў у Беларусі адзначаны заўважны рост продажу бытавой тэхнікі ў параўнанні з аналагічным леташнім перыядам. Паводле звестак Белстата, у 1,54 раза больш прададзена халадзільнікаў і маразільнікаў (235,4 тыс.), на 89,6% вырас продаж пральных машын (181,6 тыс.), на 8,6% — тэлевізараў (165,5 тыс.). Вытворчасць пральных машын за дзевяць месяцаў вырасла на 8,6% (230,7 тыс. шт.), бытавых халадзільнікаў і маразільнікаў — на 13% (938,8 тыс. шт.).

◢ **Першы адлоў таварнай фарэлі ў Бялыніцкім раёне пачнуць у лістападзе. У рыбаводнай гаспадарцы «Вабіч» выгадавана першая тона гэтай далікатэснай рыбы. Налета плануецца запусціць у вадаёмы 3-4 т малька, каб атрымаць 20-25 тон фарэлі.**

◢ Смаргонскія памежнікі ўчора на рацэ Вілія выявілі плыт з буйной партыяй цыгарэт. Пры аглядзе мясцовасці на ўчастку памежнага паста «Камелішкі» Астравецкага раёна з прымяненнем партатыўнага тэплавізара «Сыч-2» нарад выявіў плыт, што стаяў у бонавай загародзе ўсяго ў 300 м ад мяжы. Людзей і сродкаў дастаўкі груза не выяўлена. Пры разборцы плыта знойдзена 75 карабак цыгарэт «Прэм'ер» з беларускімі акцызнымі маркамі. Акалічнасці высвятляюцца.

◢ **Больш за 500 турагенцтваў Расіі займаюцца арганізацыяй медыцынскіх тураў у Віцебскую вобласць. Найбольшай папулярнасцю ў замежнікаў карыстаюцца паслугі па дапамозе пры родах, дыягностыцы захворванняў, запатрабаваная таксама дапамога стаматолагаў, хірургаў, кардыёлагаў, практолагаў. Турагенты працуюць у цесным кантакце з турыстычным сектарам бальніцы №2, які накіроўвае пацыентаў у лячэбныя ўстановы ў залежнасці ад медыцынскіх паказанняў.**

## Поўны абзац

◢ Свярдлоўскі дзяржаўны акадэмічны тэатр музычнай камедыі аб'явіў кастынг сярод кацянят на ўдзел у мюзікле пад назвай «Кошка». Адбор аб'яўлены ў сувязі з тым, што папярэднія «акцёры» падраслі, і таму прымаць удзел у спектаклі не могуць. У тэатры адзначылі, што нават калі прэтэндэнт будзе дарослай жывёлай, у яго будуць шанцы прайсці кастынг пры ўмове, што гэта будзе невялікая па памеры кошка. Акрамя падыходзячых габарытаў, кацяня павінна быць не злым, добра ладзіць з незнаёмымі людзьмі, быць абаяльным. Гаспадары ката атрымаюць магчымасць наведваць спектаклі з удзелам свайго гадаванца бясплатна. Дарэчы, тэатр не ўпершыню аб'яўляе аб вакансіі кацяняці. Мюзікл ідзе на сцэне больш за год, і за гэты час ролю кошкі паспела сыграць некалькі жывёлак.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

**ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 02 ноября 2011 г. в 14.30**
**состоятся открытые аукционные торги (повторные) по продаже имущества, обращенного в доход государства, в составе Лотов (предмет торгов):**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Лот № 1 – Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-2961 (здание нежилое, двухэтажное, кирпичное) общей площадью 578,3 кв.м, расположенное по адресу: г. Бобруйск, ул. Бахарова, 41/30,** ***находящееся в стадии реконструкции под жилой многоквартирный дом с подвалом общей площадью 358,7 кв.м (общая площадь по проектно-сметной документации 837,9 кв.м), строительство которого не завершено, не законсервировано и не зарегистрировано, процент готовности составляет 19,49 %*** | | | |
| **Лот № 2 – Изолированное помещение с инвентарным номером 710/D-399 (помещение (незавершенное строительство)) общей площадью 2 768,7 кв.м, процент готовности 98,92 %, расположенное по адресу: г. Бобруйск, ул. Ульяновская, 60, в том числе установленное оборудование: кондиционер Panasonic CS-A18GKD/CU-A18GKG, кондиционер Gree KFR-120TW/B (1241 T), система пожарной сигнализации и пожаротушения** | | | |
| **Лот № 3 – Изолированное помещение с инвентарным номером 710/D-3658 (помещение аптеки) общ.пл. 203,1 кв.м и Изолированное помещение с инвентарным номером 710/D-3657 (помещение) общ.пл. 515,4 кв.м, расположенные по адресу: г. Бобруйск, ул. Социалистическая, д. 43/35,** ***находящиеся в стадии реконструкции под двухэтажное кирпичное здание с мансардой общей площадью 1 614 кв.м., строительство которого не завершено, не законсервировано и не зарегистрировано, процент готовности 44,97 %*** | | | |
| **Организатор торгов** | **Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», г. Минск, ул. Чапаева, д. 4, к. 222, УНП 102353509** | | |
| **Место проведения торгов и подачи документов** | **г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 в здании Бобруйского управления филиала «Центр «Белтехинвентаризация»** | | |
| **Номер расчетного счета для перечисления задатка** | **Получатель платежа – Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»,** УНП 102353509, р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Банк» г. Минска код 153001369 | | |
| **Общие сведения** | **Лот № 1** | **Лот № 2** | **Лот № 3** |
| **Начальная цена продажи** | **213 273 616 рублей** | **8 321 690 447 рублей** | **1 085 328 493 рубля** |
| **Размер задатка** | **21 327 360 рублей** | **832 169 050 рублей** | **108 532 850 рублей** |
| **Площадь земельного участка** | **0,0537 га,** кадастровый № 741000000006000876, правовой режим – постоянное ользование | **0,2769 га**, что составляет 3701/10000 долей зем. участка с кадастровым № 741000000003000115, правовой режим – право общего долевого постоянного пользования без разграничения границ на местности | **0,0960 га**, кадастровый № 741000000006000225, правовой режим – постоянное пользование |
| **Условия продажи** | Аукцион без условий | | |
| **Срок и условия оплаты за приобретенное с торгов имущество** | В течение 80 календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов на счет Организатора торгов разовым платежом либо траншами | | |
| **Срок подачи документов, осмотра предмета торгов и внесения задатка** | | **с 19 октября по 01 ноября 2011 г. до 16.00** | |
| **Победитель (Претендент на покупку)** возмещает затраты на организацию и проведение аукциона не позднее 5 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона на основании счета-фактуры, выдаваемой Организатором торгов в размере 3 % от продажной цены лота № 1; в размере 0,5% от продажной цены лота № 2; в размере 1% от начальной цены продажи лота № 3. | | | |
| ****Более подробная информация об условиях участия в торгах, перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах, опубликована в газете «Рэспубліка» от 09 июня 2010 г. (по лоту № 1), в газете «Рэспубліка» от 24 июля 2010 г. (по лотам № 2 и № 3).** | | | |

**Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 52 08 45, 52 86 96, 52 70 32, 8 (029) 654 79 06 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.**

| МАГІЛЁЎСКІ АБЛАСНЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ | МОГИЛЕВСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ |
|---|---|
| **РАШЭННЕ** | **РЕШЕНИЕ** |
| 29 сентября 2011 г. № 14-32 | |
| г. Магілёў | г. Могилев |

О внесении изменения и дополнения в решение Могилевского областного исполнительного комитета от 25 февраля 2011 г. № 4-2

На основании предложений комитета экономики облисполкома Могилевский областной исполнительный комитет решил:

Внести в перечень открытых акционерных обществ, акции (доли в уставных фондах) которых, находящиеся в областной коммунальной собственности, подлежат продаже плана приватизации объектов областной коммунальной собственности на 2011—2013 годы, утвержденного решением облисполкома от 25 февраля 2011 г. № 4-2 «Об утверждении плана преобразования унитарных предприятий областной коммунальной собственности в открытые акционерные общества и плана приватизации объектов областной коммунальной собственности на 2011—2013 годы», следующие изменение и дополнение:

в разделе «2011 год» подраздел

**«Комитет экономики облисполкома**

Могилевское ОАО «Красный металлист»»

исключить;

раздел «2012 год» дополнить подразделом следующего содержания:

**«Комитет экономики облисполкома**

Могилевское ОАО «Красный металлист»».

Председатель Могилевского областного исполнительного комитета — П.М. Рудник

Управляющий делами Могилевского областного исполнительного комитета — Г.А. Воронин

# На Пакроў скралі абразы

Каштоўныя рэчы зніклі з храма Святых царственных пакутнікаў у Магілёве. Храм ужо неаднаразова рабавалі. Цяпер невядомыя зладзеі знеслі 4 абразы, пазалочанае блюда і Евангелле. Скрадзенае ацэнена ў 6 мільёнаў 650 тысяч рублёў. Міліцыя завяла крымінальную справу. Самая каштоўная рэч са страчанага — абраз, якому, мяркуецца, больш за дзве сотні гадоў. На ім выява святога бяссрэбраніка, і гэты абраз не рэстаўраваўся. Настаяцель храма айцец Сергій і прыхаджане асабліва расстроены тым, што варварскі ўчынак прыпаў на свята Пакроў Прасвятой Багародзіцы. Вернікі выказалі надзею, што Бог пашле злодзею пакаянне, каб ён адумаўся і вярнуў абразы царкве.

**Алена КАЗЛОВА.**

## Прамая лінія

# АСТЭАПАРОЗ І АРТРОЗ

**19 кастрычніка, у сераду, з 16.00 да 17.00** у рэдакцыі нашай газеты адбудзецца «прамая лінія» з удзелам **загадчыка кафедры траўматалогіі і артапедыі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, доктара медыцынскіх навук Алега Пятровіча КЕЗЛІ.** Ён адкажа на вашы пытанні, звязаныя з захворваннямі і пашкоджаннямі буйных суставаў, пераломамі касцей, якія няправільна зрасліся, з астэапарозам і пераломамі ў пажылых.

Нумары «прамой лініі»: **8 (017) 292 38 92 і 292 38 21.**

Папярэднія пытанні можна задаць па нумарах: **8 (017) 287 18 36 і 287 18 29.**

## ПРАМАЯ ЛІНІЯ

19 кастрычніка 2011 года з 14.00 да 16.00 Камітэт дзяржаўнага кантролю праводзіць «прамую лінію», падчас якой будзе вывучана сітуацыя з забяспечанасцю студэнтаў месцамі ў інтэрнатах устаноў адукацыі і ўмовамі пражывання ў іх.

Падчас «прамой лініі» жыхары рэспублікі могуць паведаміць інфармацыю аб выкананні заканадаўства пры забеспячэнні студэнтаў месцамі ў інтэрнатах устаноў адукацыі, стане матэрыяльна-тэхнічнай базы інтэрнатаў і якасці ўмоў пражывання.

**Тэлефон «прамой лініі» — (017) 328 69 40.**

## Футбол. Чэмпіянат Беларусі

# ПРЭТЭНДЭНТЫ НА П'ЕДЭСТАЛ АТРЫМАЛІ ПЕРАМОГІ

**У мінулыя выхадныя прайшоў чарговы, 28-ы тур чэмпіянату Беларусі па футболе.**

Яго праграму адкрываў пятнічны матч паміж БАТЭ і «Мінскам». Сталічная каманда нічога супрацьпаставіць чэмпіёну не змагала — 0:2. «Шахцёр» таксама абыграў брэсцкае «Дынама» — 1:0. Ну і «Гомель», які замыкае тройку лідараў, таксама ачкі не згубіў, перайграўшы «Віцебск» — 2:0. І толькі сталічнае «Дынама», амбіцыі якога зусім не ў раёне чацвёртага месца, якое зараз займае каманда, перарвалі сваю пераможную серыю. Віной усяму «Тарпеда», што і не дзіўна, бо з пэўнага часу для Сяргея Гурэнкі падпсаваць настрой бела-сінім — справа гонару. Пяць матчаў запар ён не прайграе «Дынама». У выніку на гэты раз баявая нічыя — 1:1. Самым выніковым стаў матч паміж «Белшынай» і «Нёманам» — гродзенская каманда забіла на адзін мяч больш (3:2). А «Нафтану» хапіла ўсяго аднаго мяча, каб атрымаць перамогу над «Дняпром» — 1:0.

Становішча ў турнірнай табліцы: 1. БАТЭ — 58 ачкоў; 2. «Шахцёр» — 49; 3. «Гомель» — 46; 4. «Дынама» Мн — 43; 5. «Белшына» — 38; 6. «Нафтан» — 34; 7. «Тарпеда-БелАЗ» — 34; 8. «Дынама» Бр — 33; 9. «Нёман» — 31; 10. «Мінск» — 30; 11. «Віцебск» — 28; 12. «Днепр» — 21.

**Алена КРАВЕЦ.**

Інстытут журналістыкі БДУ выказвае спачуванне дацэнту кафедры тэлебачання і радыёвяшчання Шэіну Валерыю Мікалаевічу ў сувязі з напаткаўшым яго горам — **смерцю БРАТА.**

